**Марына Курбан**

## Падарожжа старых ботаў

*Добра быць коласам, але шчаслівы той,*
*каму давялося быць васільком.*
*Бо нашто каласы, калі няма васількоў.*
*Максім Багдановіч*

Чаго толькі не было на гарышчы старой хаты, куды гаспадары выкідалі розныя непатрэбныя рэчы!

Ужо шмат гадоў тут адлежвалі бакі старыя дубовыя начоўкі; каля іх валяліся іржавыя нажы, сякеры, далаты; у цёмным закутку прымасціліся грэблі, скоблі, разцы. Крыху воддаль стаялі кляновыя вёдры, на якіх узвышаліся акуратна складзеныя абручы для бочак з арэшніку. Калодкі, палены, дошкі, брускі – усё пакрылася густым пылам…

А пад самаю страхою на драўлянай жэрдцы віселі два боты – два родныя браты. Павукі наставілі на іх густыя сеткі павуціны, так што колер немагчыма было вызначыць праўдзіва.

Нельга сказаць, што ботам гэта падабалася, але што зробіш. Прыходзілася цярпець.

Ніхто з іх не памятае, колькі яны цярпелі, але аднойчы, калі праз шчыліну заглянуў праменьчык сонца, адзін з братоў загаварыў:

– Братка, ты яшчэ жывы?
– Жывы, - адказаў другі бот.
– І колькі нам вісець тут на гэтай жэрдцы? – слабым голасам спытаў ён.

Дзе наш гаспадар Даніла? Чаму ён не прыходзіць па нас?

– Не ведаю, брат… Забыўся, мабыць, што мы на свеце жывём. А мы ж яшчэ не такія стаптаныя боты, каб дажываць свой век у павуцінні і бруду.

– А памятаеш, як мы калісьці красаваліся?

– Яшчэ як памятаю! Даніла ніколі з намі не разлучаўся. Мы ж разам з Аўдоцццяй радаваліся яго радасцям, гаравалі яго горам.

– Што сталася з нашым гаспадаром? Сколькі гадоў прайшло, як мы вісім тут? А запамятаваў усё, - парыпаў старым абцасам бот.

– Ведаеш, братка, а ці не пайсці нам пашукаць яго? – даў добрую параду адзін з ботаў.

– Хадзем, можа ўспомнім што! – ахвотна згадзіўся другі.

Сказаўшы гэта, ён штурхнуў брата ў бок, саскочыў з жэрдкі на падлогу і, танцуючы, заспяваў песеньку, якую некалі чуў:

Купіў боты за тры злоты,
За рубель галошы,
Паглядзіце на мяне,
Не шкада і грошы!

Убачыўшы, як брат па-маладзецку тупае, сам не ўцярпеў, саскочыў уніз і заспяваў:

Усе ідуць, усе ідуць,
Усе лапцямі скрабуць,
А мой мілы ў ботах
Ходзіць на работу!

Даскакалі браты да краю гарышча, спусціліся па лесвіцы. Хацелі зайсці ў хату, але на дзвярах вісеў іржавы замок. Убачыўшы знаёмыя веснічкі, выбеглі на двор.

Каля старога плыта, побач з хлявом, ляжаў вялікі сабака. Браты хутка адбеглі ад яго, памятаючы, што калісьці сабакі часта хапалі іх за пяты…

На вуліцы нікога не было. Але ішлі яны цішком, па вузкай сцежцы між агародчыкаў. Спачатку на іх шляху сустракаліся старэнькія, нізенькія хаткі з акенцамі ў адну шыбку і замшэлымі саламянымі стрэхамі. Браты памяталі гэтыя хаткі: калісьці Даніла хадзіў па гэтай дарозе да пані з вялікага двара, каб завезці ёй бялюткія, як малако, гучныя, як шкло, пасудзіны ўласнай працы. Памяталі, як білася сэрца бондара ад шчасця і нязмернай радасці сустрэчы з пані.

Так ішлі браты, размаўляючы пaціху паміж сабою. І раптам убачылі двухпавярховы дом, які адразу пазналі. Ужо не новы, з чарапічным дахам… Ганак з высокімі каменнымі слупамі, у высокія вузкія вокны лілося сонечнае святло…

Каля дома ходзіць пані гордаю ступою, слаўная багаццем і красою сваёй. Не такая ўжо і маладая, але такая ж напышлівая і важная. Усплылі ў памяці братоў Данілавы слёзы, яго бязмежна балючая крыўда на яе, памерлыя мары… Тое, дзеля чаго яму варта было жыць і пакутваць, было растаптана пані.

Успомнілі браты і дарогу дадому ў вёску, калі ногі Данілы ледзь валачыліся, а саму прыроду пакрыла чорная жалоба…

Так і хацелася спытаць ім у пані:

– Ці рабіла ты дабро? Ці заўважала патрэбы простых людзей? Ці цаніла залатыя рукі майстроў?

А ў адказ пачуць :

– Так, я была жорсткай і гордаю. Калі прыходзіў бядняк, я адварочвалася ад яго, не цікавілася нічым, акрамя свайго багацця і асабістай значнасці.

Шкада, што пані ніколі так не адкажа… Ніколі… Ніколі…

Завярнулі боты з вуліцы і падаліся выганам да сваёй хаціны. А ў думках усплывалі сумныя дні, калі іх гаспадар закінуў бондарства і цэлымі днямі валяўся ў карчме п’яны; калі іх знялі з нябожчыка-Данілы, бо той не вытрымаў такога жыцця. Жыцця без мэты, без радасці, без творчасці… Калі закінулі іх на гарышча… Назаўсёды…

Родная хата… Такая адзінокая, нікому непатрэбная… Заплакалі браты з гора ды патупалі па-маленьку назад, на гарышча – дажываць веку.